*УДК 378.147*

# ЛІНГВАМЕТАДЫЧНАЯ І РЫТАРЫЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧАГА НАСТАЎНІКА-ФІЛОЛАГА: АКСІЯЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

**Н. Э. Шандроха**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь, nshandroha@yandex.by*

Артыкул прысвечаны актуальнай праблеме лінгваметадычнай і рытарычнай падрыхтоўкі будучага настаўніка-філолага, у тым ліку з пазіцый аксіялогіі філалагічнай адукацыі. Адзначаны важныя ў аспекце названай праблемы лігваметадычныя ідэі вядомага айчыннага вучонага-метадыста В. У. Протчанкі: прызначэнне метадычнай навукі з пункту гледжання каштоўнасных арыентацый, узаемасувязь фарміравання моўнай асобы вучня і моўнай асобы настаўніка і інш. Аўтар артыкула канстатуе актуальную праблему недаацэнкі рытарычнага аспекту ў метадычнай падрыхтоўцы будучых настаўнікаў-славеснікаў. Указваюцца прабелы па валоданні маладымі настаўнікамі метадычнай і рытарычнай архітэктонікай урока ў сучаснай школьнай практыцы. Абгрунтоўваецца думка аб міждысцыплінарнай інтэграцыі дысцыплін «Методыка выкладання беларускай мовы» і «Рыторыка» ў сістэме вышэйшай педагагічнай адукацыі.

***Ключавыя словы:*** аксіялагічная лінгваметодыка; настаўнік-філолаг; рытарычная і метадычная падрыхтоўка; рытарычная архітэктоніка ўрока.

# LINGUOMETODIC AND RHETORICAL TRAINING OF THE FUTURE TEACHER-PHILOLOGIST: AXIOLOGICAL ASPECT

**N. E. Shandrokha**

*Yanka Kupala Grodno State University,*
*Ozheshko str., 22, 230023, Grodno, Belarus, nshandroha@yandex.by*

The article is devoted to the actual problem of linguo-methodological and rhetorical training of the future teacher-philologist, including from the standpoint of the axiology of philological education. The liquamethodical ideas of the famous Russian scientist-methodologist V. U. Protchenko, which are important in the aspect of this problem, are noted: the appointment of methodological science from the point of view of value orientations, the relationship between the formation of the student's linguistic personality and the language personality of the teacher, etc. The author of the article states the actual problem of underestimating the rhetorical aspect in the methodological training of future teachers-wordsmiths. The gaps in the possession of young teachers of the methodological and rhetorical architectonics of the lesson in modern school practice are called. The idea of interdisciplinary integration of the disciplines «Methods of teaching the Belarusian language» and «Rhetoric» in the system of higher pedagogical education is substantiated.

***Key words:*** axiological linguomethody; teacher-philologist; rhetorical and methodical preparation; rhetorical architectonics of the lesson.

Важным арыенцірам пры асэнсаванні задач сучаснай адукацыі з’яўляецца аксіялогія як навука пра каштоўнасці, каштоўнасныя арыентацыі і паняцці. Так, пачынаючы з апошняй трэці XX стагоддзя, у лінгваметодыцы праблемы навучання і выхавання як вучняў на ўроках мовы і літаратуры агульнаадукацыйных школ, так і будучых настаўнікаў

у ВНУ, былі ў цэнтры ўвагі шэрагу вучоных і настаўнікаў-практыкаў. У прыватнасці, у апошнія дзесяцігоддзі ўдакладняецца і абгрунтоўваецца тэрмін «аксіялагічная лінгваметодыка». Названы тэрмін гучыць у назве навуковай школы расійскага вучонага, прафесара А. Д. Дэйкінай, паколькі менавіта ёй належыць заслуга ў паслядоўнай распрацоўцы і абгрунтаванні аксіялагічнай тэматыкі. У адной з апошніх манаграфій [1] навукоўцам асветлены шэраг аспектаў аксіялагічнай методыкі выкладання рускай мовы, у цэнтры якой знаходзіцца паняцце каштоўнасці ў дачыненні галоўным чынам да вывучэння рускай мовы ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе. Шматгадовы навуковы і выкладчыцкі вопыт А. Д. Дэйкінай дазволіў раскрыць актуальныя пытанні метадалогіі ў аксіялагічным вымярэнні: мэты, падыходы, прынцыпы, метады і тэхналогіі. У дачыненні да эстэтыкі мовы і маўлення ў сістэме вышэйшай адукацыі расійскі вучоны-метадыст трапна адзначае: «Адукаваны чалавек характарызуецца ведамі ў мове і іх адлюстраваннем у маўленні. Студэнт, а затым выпускнік ВНУ валодае (павінен валодаць) важнай асобаснай якасцю – імкненнем да ўдасканалення сваёй моўнай кампетэнтнасці і сваёй маўленчай культуры. Моўная асоба, якой уяўляецца кожны адукаваны чалавек, і ў соцыуме, і ў прафесійнай дзейнасці, і ў навуковай сферы праяўляе сябе як носьбіт мовы і як уладальнік індывідуальнага стылю маўленчых паводзін» [1, с. 36].

Акцэнтуючы ўвагу на аксіялагічным аспекце лінгваметадычнай і рытарычнай падрыхтоўкі будучага настаўніка-філолага, аўтар дадзенага артыкула з пашанай і ўдзячнасцю ўспамінае навуковага кіраўніка свайго дысертацыйнага даследавання, вядомага вучонага-метадыста, аднаго з першых дактароў педагагічных навук у галіне методыкі выкладання беларускай мовы, прафесара В. У. Протчанку, чый 90-гадовы юбілей быў адзначаны летась у айчыннай педагагічнай супольнасці. Васіль Ульянавіч заўсёды смела адстойваў надзённыя лінгвадыдактычныя ідэі ў навуковых дыскусіях і смела абараняў права беларускай мовы на прыярытэтную пазіцыю ў грамадстве і школе.

Актуальнай крыніцай у дачыненні да названай праблемы даследавання, а таксама настольнай кнігай для студэнтаў-філолагаў і настаўнікаў-практыкаў з’яўляецца манаграфія В. У. Протчанкі «Актуальныя пытанні тэорыі і практыкі навучання беларускай мове» [2], у якой з улікам апошніх патрабаванняў сучаснай лінгваметодыкі аўтар аргументавана паказаў прызначэнне айчыннай метадычнай навукі: *«Метадычная навука абавязана дапамагчы настаўнікам-практыкам глыбока асэнсаваць, <u>для чаго</u>* (тут і далей падкрэслена мной. – Н. Ш.)

*неабходна школьнікам ведаць родную мову, чаму трэба вучыць на кожным канкрэтным этапе і як гэта рабіць»* [2, с. 57]. У заслугу вучонаму-метадысту можна паставіць яго прафесійна высакароднае імкненне ўзнесці беларускую метадычную навуку на якасна новы навуковы ўзровень, запатрабаваны сучаснай школьнай моўнай практыкай. Ён лічыў эфектыўнай такую методыку выкладання роднай мовы, якая актывізуе маўленчую дзейнасць школьніка.

З пазіцый аксіялогіі неаднаразова ў працах В. У. Протчанкі сцвярджалася: будучы настаўнік-славеснік павінен усведамляць, што школа не можа быць проста месцам працы, бо менавіта тут фарміруецца АСОБА. І не толькі АСОБА ВУЧНЯ, але і АСОБА НАСТАЎНІКА. Выхаванне моўнай асобы з пазіцый каштоўнасных арыентацый В. У. Протчанка разглядаў у якасці дамінантнай ідэі, якая павінна пранізваць увесь навучальна-выхаваўчы працэс у сучаснай школе: *«Наспела неабходнасць пераарыентацыі зместу адукацыі на асобу, але пры ўмове, што вучань жыве і дзейнічае не ў абстрактнай прасторы, а ў канкрэтнай сям'і, нацыянальным калектыве, этнічнай і рэлігійнай групе людзей, мае пэўны вопыт у вучобе, цікавасць і мэту ў жыцці»* [2, с. 32], *«... родную мову варта вывучаць не толькі як знакавую сістэму і сродак абмену думкамі, як гэта нярэдка дэкларуецца ў метадычных распрацоўках і афіцыйных паперах. Неабходна так наладжваць навучальны працэс, каб моўная адукацыя садзейнічала засваенню культуры беларускага народа, а адным з галоўных накірункаў у рабоце настаўнікаў стала фарміраванне вучня як моўнай асобы – носьбіта мовы, яе творцы, суб'екта, які любіць роднае слова, беражэ яго і карыстаецца ім перш-наперш як інфарматыўным сродкам ва ўсіх сферах жыццядзейнасці: пазнавальнай, навучальнай, нацыянальна-культурнай, бытавой»* [2, с. 57].

Сцісла аналізуючы лінгваметадычную і рытарычную падрыхтоўку будучага настаўніка-філолага, заўважым, што сёння існуе праблема **недаацэнкі рытарычнага аспекту ў метадычнай падрыхтоўцы** будучых настаўнікаў-славеснікаў. Так, у сучаснай школьнай практыцы відавочныя прабелы па валоданні маладымі настаўнікамі метадычнай і рытарычнай архітэктонікай урока. Спынім увагу толькі на некаторых заўвагах:

**1.** На жаль, часта па-за ўвагай настаўніка застаюцца рытарычныя правілы, прыёмы і парады па арганізацыі педагагічнага маўлення, і дыдактычнасць часта перамагае рытарычнасць. Як сведчыць педагагічная практыка студэнтаў у школе, рытарычна няграматныя паводзіны маладога настаўніка могуць прыводзіць да шматлікіх

педагагічных пралікаў.

**2.** Кожны ўрок, як і педагагічную прамову, пажадана структураваць згодна з класічнымі часткамі рытарычнага канону, дзе настаўнік мэтанакіравана плануе тэму і мэту ўрока (*inventio*), плануе структурныя часткі як самога ўрока, так і свайго маўлення (*dispositio*), аздабляе маўленне сродкамі слоўнай арнаментацыі (*elocutio*), запамінае ход урока і суразмоўніцтва з вучнямі (*memoria*), а таксама валодае тэхнікай выканання прамовы (*actio*).

**3.** Недастаткова ўвагі надаецца і педагагічнаму маўленню пераканальнага характару. Важна вучыць будучых настаўнікаў-філолагаў правільна фармуляваць сваю думку, аргументаваць яе і захоўваць культуру суразмоўніцтва. Прыродная логіка дадзена не многім, а сістэмнае навучанне лагічнай аргументацыі далёка не заўсёды знаходзіць месца ў працы настаўніка. У прыватнасці, настаўнік-прадметнік, а тым больш настаўнік-філолаг, ідучы на ўрок ці, напрыклад, на педсавет, пасяджэнне матадычнага аб’яднання, бацькоўскі сход і інш., туды, дзе будзе карыстацца словам і праяўляць сябе ў актыўным маўленні, павінен добра карыстацца ўменнямі пераканальнага ўздзеяння на вучняў, калег, бацькоў.

**4.** Не вывучаецца ў дастатковым аб’ёме ў ВНУ і ўвесь арсенал прафесійна значных для настаўніка рытарычных жанраў. Як сведчаць сучасныя рытарычныя даследаванні, у настаўніцкай прафесіі налічваецца каля 100 жанраў. Больш таго, сёння патрабуюць удасканалення ў рытарычным аспекце і такія класічныя паўсядзённыя маўленчыя жанры ў прафесіі настаўніка, як тлумачальны маналог, інфармацыйная прамова, абагульняльнае слова, вучэбна-маўленчая сітуацыя на ўроку, педагагічны дыялог, канспект урока і інш.

Падагульняючы названае вышэй, адзначым, што лінгваметадычная і рытарычная падрыхтоўка будучага настаўніка-філолага з пазіцый каштоўнасных арыентацый навучання патрабуе больш пільнага разгляду і далейшага даследавання. Зразумела, што адзін з аргументаў названай сітуацыі – скарачэнне колькасці гадзін на вывучэнне беларускай мовы ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе і неапраўданае скарачэнне як колькасці гадзін, так і цэлых дысцыплін у вучэбных планах ВНУ. Указваючы толькі ў самых агульных рысах метадычныя і рытарычныя пралікі, акцэнтуем увагу на актуальнасці міждысцыплінарнай інтэграцыі вузаўскіх дысцыплін «Методыка выкладання беларускай мовы» і «Рыторыка». Названую выснову лічым мэтазгодным пацвердзіць словамі прафесара В. У. Протчанкі: *«...нельга ўявіць сабе на пасадзе настаўніка роднай мовы чалавека, які па-майстэрску не валодае родным*

*словам у сваёй прафесійнай, бытавой, нацыянальна-культурнай, мастацка-творчай і грамадскай дзейнасці»* [2, с. 54].

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Дейкина А. Д.* Аксиологическая методика преподавания русского языка: монография. М. : МПГУ, 2019.

2. *Протчанка В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. Мінск : НІА, 2001.